№ 38 (955)
Кастрычнік 2023 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года



*Царква Успення Багародзіцы ў м. Новы Свержань Мінскага павета. Фота Яна Балзункевіча. 1914 г.*

# Базыльянскі манастыр і духоўная семінарыя ў Новым Свержні

***У 1740-х гадах у мястэчку Новы Свержань Навагрудскага павета Вялікага Княства Літоўскага Міхалам Казімірам Радзівілам «Рыбанькам» былі заснаваны базыльянскі манастыр і духоўная семінарыя – першая ў XVIII стагоддзі на землях ВКЛ навучальная ўстанова, прызначаная адмыслова для падрыхтоўкі белага ўніяцкага духавенства. Мястэчка Новы Свержань для размяшчэння манастыра і семінарыі было абрана невыпадкова. Свержань быў важным лагістычным цэнтрам – адсюль па Нёмане пачынаўся адзін з галоўных траспартных шляхоў на Каралявец (Кёнігсберг). Менавіта ў Свержні знаходзіўся першы на Нёмане порт і прыстань («рум») для захоўвання тавараў і рачных суднаў-віцін – з гэтага ўчастка рака рабілася суднаходнай*.**

Першыя пісьмовыя згадкі пра Свержань (Свержна) датуюцца 1428 г. Побач з дваром існавала вёска з аналагічнай назвай (сёння в. Стары Свержань). Паселішча Свержна, якое ў XV ст. было павятовым і парафіяльным цэнтрам, у сярэдзіне XVI ст. падзялілася на дзве часткі: старая частка, што засталася вёскай, пачала называцца Старым Свержнем, за часткай, якая фарміравалася вакол новага мястэчка, замацавалася назва Новы Свержань. У другой палове XVI ст. на супрацьлеглым баку Нёмана акурат насупраць мястэчка існаваў яшчэ і замак Свержна. У новазаснаваным мястэчку была пабудавана новая парафіяльная царква. У інвентары мястэчка за 11 кастрычніка 1569 г. ужо згадваецца царква Святой Прачыстай, пры якой знаходзіўся «поп Харытон», які меў у сваім валоданні зямлі «на 60 бочак» і сенажацей «на 60 вазоў». Гэтаму ж папу Харытону належалі два прыгонныя дымы. Царква, відавочна, яшчэ была драўлянай. У 1578 г. сверажанскі маёнтак перайшоў у валоданне Мікалая Крыштофа Радзівіла «Сіроткі». У частцы маёнтка, што знаходзілася на правым беразе Нёмана і якая ў выніку падзелу 1582 г. адышла да роду Слушкаў, у 1593 г. было заснавана яшчэ адно мястэчка з такой жа самай назвай – Свержна. Паміж 1616 і 1626 гадамі, каб пазбегнуць блытаніны, за гэтым мястэчкам замацавалася назва Стоўбцы. Дзесьці ў канцы 1590-х гг. у Свержні-Стоўбцах таксама была заснавана асобная парафія з царквой.

10 верасня 1592 г. «Сіротка» надаў новасвержанскай царкве дзве валокі зямлі ў самім Свержні і адну – у Залужжы. Гэтыя зямельныя надзелы засталіся ў валоданні царквы да сярэдзіны XIX ст. У 1592 г. царква альбо ўжо была мураванай, альбо яшчэ будавалася. Справа ў тым, што з канца 1580-х гг. пачынаецца актыўнае будаўніцтва «Сіроткам» мураваных храмаў у сваіх маёнтках. У 1589 г. – касцёла ў Новым Свержні, у 1599 г. – касцёла ў Міры. Паралельна ў абодвух мястэчках узводзяцца і новыя мураваныя цэрквы.Пад пастановай саборыка ўніяцкага духавенства навагрудскага афіцыялату ад 15 кастрычніка 1626 г. мы бачым подпісы святароў усіх трох навакольных цэркваў: старасвержанскай, новасвержанскай і стаўбцоўскай. Святаром у Новым Свержні на той час быў айцец Міхайла Лявонцевіч. Царква з цвінтаром узгадваецца ў інвентары 1647 г. Згодна з ім яна знаходзілася ў другім квартале рынкавай плошчы мястэчка. Там жа згадваецца таксама пляц для пражывання «*айца свяшчэнніка*» на вуліцы Глухой і дзве валокі нададзенай яму зямлі. У 1821 г. царква апісваецца наступным чынам: «*...мураваная, усярэдзіне і звонку часткова атынкаваная, мае драўляную вежу з жалезным крыжам*». Пад драўлянай вежай маецца на ўвазе т.зв. сігнатурка, а не мураваная званіца, зробленая над прытворам разам з асноўным корпусам царквы ў канцы XVI ст. «*Царква мураваная з адной высокай вежай*» – так апісваецца храм у ведамасці 1797 г.

Візіта ад 19 лістапада 1680 г. фіксуе ў мястэчку мураваную царкву пад тытулам Успення Багародзіцы. Такі тытул (у тым ліку ў больш архаічнай форме – «Прачысценская» альбо «Святой Прачыстай») быў у яе ад самага заснавання ў сярэдзіне XVI ст. У 1784 г. манастырская царква насіла ўжо падвойны тытул – Успення Багародзіцы і Святых Пятра і Паўла. Традыцыя асаблівага шанавання святаў Успення Багародзіцы і Св. Пятра і Паўла фіксавалася пры царкве яшчэ і ў 1879 г. Аднак у 1821 г. яе тытул зноў пазначаны проста як Успення Багародзіцы.

Святаром пры царкве ў 1680 г. быў Ян Леванові ч, святаром-памочнікам яго сын Мацей. Парафія складалася з 600 душ. У 1680 г. яе тэрыторыя была яшчэ адносна кампактнай, выцягнутай ад Новага Свержня да Халаімаўшчыны, і складала ў максімальным адцінку 8 км. Святар новасвержанскай царквы Васіль Гамаліцкі ў 1712 г. спрабаваў гвалтам далучыць да сваёй парафіі дзве вёскі суседняй старасвержанскай парафіі, што стала прычынай звароту святара са Старога Свержня да радзівілаўскай адміністрацыі з просьбай выдаць пацвярджальны фундуш на царкву з падрабязным апісаннем межаў парафіі. Аднак пашырэнне новасвержанскай парафіі гэта не спыніла.

***(Заканчэнне на стар. 3)***

# Базыльянскі манастыр і духоўная семінарыя ў Новым Свержні

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)*

Да 1784 г. парафія ўжо манастырскай царквы разраслася ў розныя бакі настолькі, што адлегласць паміж крайнімі пунктамі (Халаімаўшчына і Атцэда) складала 19 км удаўжыню (і каля 10 км ушыркі – ад Новага Свержня да Мікалаеўшчыны). Яна стала такой разлеглай, што манастыр мусіў сваім коштам утрымліваць дзве фурманкі з фурманамі для пастаянных раз'ездаў. Пасля закрыцця манастыра ў сярэдзіне XIX ст. парафія была зноў паменшана да кампактных памераў.

Новасвержанскі святар Ян Левановіч, згаданы ў візіце 1680 г., займаў на той час пасаду клецкага пратапопа – ён быў прадстаўніком сярэдняга звяна ў епархіяльнай іерархіі. Тое, што новасвержанскія святары часта рабіліся пратапопамі (дэканамі), сведчыць аб важнасці царквы і парафіі. Прычым новасвержанскія святары, як бачым з прыкладу Яна Левановіча, узначальвалі неабавязкова Нясвіжскі дэканат, на тэрыторыі якога знаходзілася сама царква. Новасвержанская царква і парафія ў гэтым плане былі своеасаблівай экстэрытарыяльнай адзінкай. Так, напрыклад, новасвержанскі святар Павел Жураўскі ў 1696 г. займаў пасаду галубіцкага пратапопа. Галубіцкая пратапопія адносілася да Полацкай архіепархіі (да бліжэйшай парафіі гэтай епархіі ад Новага Свержня па прамой – каля 150 км).Грошы на гэтую ўстанову выдаткаваў і новасвержанскі святар Міхайла Лявонцевіч. Месцам стварэння будучай навучальнай установы быў абраны Мінск. Пытанне аб адкрыцці духоўнай семінарыі для духавенства «Літоўскай» часткі Кіеўска-Віленскай уніяцкай епархіі ўздымалася яшчэ на агульнацаркоўным саборы ў верасні 1626 г. у Кобрыне. Навагрудскі саборык, які адбыўся 15 кастрычніка таго ж года, выконваючы рашэнні сабора, пастанавіў пачаць збор сродкаў з мясцовага духавенства: «*Абысмы мели школу досконалую латинскую и словенскую для науки детем священническим и шляхетским и розных станов, которие бы се до того приложит хотели*». Грошы на гэтую ўстанову выдаткаваў і новасвержанскі святар Міхайла Лявонцевіч. Месцам стварэння будучай навучальнай установы быў абраны Мінск. Пытанне адкрыцця мітрапаліцкай семінарыі было адной з галоўных задач кіеўскага мітрапаліта Іосіфа Вельяміна-Руцкага. У сваім тастаменце ад 1627 г. ён згадаў яе цэлых сем разоў. Гаворачы, што ў Вільні добрападрыхтаванае духавенства можна было ўзяць толькі з ліку манахаў Траецкага манастыра, Вельямін-Руцкі пісаў, «*же семинарыумъ еще не было, которое тепер за Божю помочю быт мусит*». Рэальную дзейнасць Мінская семінарыя распачала толькі ў канцы 1640 – пачатку 1650-х гг., а з пачаткам вайны з Маскоўскай дзяржавай у 1654 г. спыніла сваё існаванне, хоць праекты яе аднаўлення праіснавалі да канца XVII ст.

Пасля правядзення маштабнага сабора ўніяцкай царквы ў Замосці ў 1720 г. і заканчэння Вялікай Паўночнай вайны на першы план зноў выйшла пытанне адкрыцця на тэрыторыі ВКЛ адмысловай навучальнай установы для белага духавенства. У 1722 г. мітрапаліт Л. Кішка пісаў: «*Семинарыумъ есть згромаженіе младенцевъ на едино место, хотящихъ въ свое время пріяти чинъ іерейства, по выслуханію вшелякихъ наукъ, от которыхъ великій в проповеданіи Слова Божіаго и въ администрацыи Святыхъ Сакраментовъ бываетъ Церкви Божой пожитокъ, яко дознаемо в Церкви Римской, маючой годныхъ людей и научителей, выходящихъ з Семинарыум. Тое святое дело постановилъ Соборъ Трідентскій, наказуючій абы кождый епископъ, архимандрита, презвитеръ и самыя обители законныя складалися на Семинарыумъ*». 5 чэрвеня 1739 г. М.К. Радзівіл «Рыбанька» са сваёй жонкай склалі т.зв. *інтэрцызу* (дамову) з протакансультарам Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна, настаяцелем манастыра ў м. Быцень Слонімскага павета Феадосіем Канячэўскім на «*манастыр іх міласцяў айцоў базыльян Літоўскай правінцыі ў горадзе нашых спадчынным Свержні пры царкве здаўна мураванай*». Меркавалася, што ўжо да Божага Нараджэння 1740 г. манастыр з семінарыяй з рэктарам, 4 манахамі і 12 семінарыстамі будуць дзейнічаць, аднак справа зацягнулася.

На ўтрыманне манастыра перадавалася ўся ўласнасць царквы, уключна з зямельнымі надзеламі. Апрача гэтага 12 ліпеня 1743 г. быў складзены фундуш будучага манастыра на суму ў 74 300 злотых, з якой штогод манахам павінна было выплачвацца 7 % (5 200 злотых). Сума была запісаная на маёнткі Затур'я, Пясочнае, Цэтра і Барацін у наступнай прапорцыі: 30 000 – на фальварак Дыямпаль з вёскай Затур'я, 30 000 – на маёнткі Пясочнае і Цэтра, 14 300 – на фальварак Барацін. Працэнты павінны былі выплачвацца двойчы на год – у дзень Св. Яна (24 чэрвеня) і на Божае Нараджэнне (25 снежня).

Са своечасовай выплатай працэнтаў амаль заўсёды былі цяжкасці. Рэктар Юрый Шаталовіч пісаў аб гэтым М.К. Радзівілу «Рыбаньку» ўжо ў ліпені 1758 г. Пасля смерці «Рыбанькі» ў маі 1762 г. сумы выплат скараціліся больш чым удвая. У верасні 1767 г. на нявыплату працэнтаў за апошнія тры гады скардзіўся ўжо рэктар Іеранім Манкевіч. Пастаянныя праблемы з выплатай працэнтаў даводзілі рэктараў да адчаю. Рэктар Гедэон Гаеўскі 20 красавіка 1772 г. пісаў, што немагчымасць атрымаць належнае фінансаванне ў прамым сэнсе звяла ў магілу папярэдняга рэктара І. Манкевіча, а зараз праз бяссілле што-небудзь змяніць у жыцці свайго манастыра пра смерць мусіць задумацца і сам Г. Гаеўскі. Чарговы гарант новасвержанскага фундуша Караль Станіслаў Радзівіл «Пане Каханку» ў 1769 – 1777 гг. па палітычных матывах быў вымушаны эміграваць за межы Рэчы Паспалітай, і з выплатай працэнтаў пачаліся яшчэ большыя праблемы. З 1780-х гг. радзівілаўская адміністрацыя практычна цалкам спыніла выплату. Нявыплата працэнтаў істотна адбілася на функцыянаванні манастыра і семінарыі – у 1780-х гг. штат манахаў зменшыўся з 5 да 3. Гэта змусіла рэктара Ігната Шымкевіча ў 1794 г. распачаць супраць непаўналетняга Даменіка Радзівіла і яго апекуноў працэс у Навагрудскім земскім судзе. Хоць суд абавязаў радзівілаўскую адміністрацыю выплачваць працэнты ў вызначаны тэрмін, аднак праблемы з іх выплатай працягваліся і далей. У 1809 г. з утварэннем Літоўска-Віленскай епархіі семінарыя набыла статус епархіяльнай, і ў справу быў вымушаны ўмяшацца мітрапаліт Рыгор Кахановіч. 5 сакавіка 1812 г. ён склаў скаргу на радзівілаўскую адміністрацыю, дзе засведчыў, што за ўвесь перыяд існавання семінарыі з боку Радзівілаў назбіралася запазычанасць у больш за 100 тысяч злотых. Негледзячы на чарговае станоўчае для манастыра рашэнне суда працэнты зноў выплачваліся не ў час і не ў поўным аб'ёме. Запазычанасць так і не была кампенсаваная да самага закрыцця манастыра ў 1833 г. Апошні раз пытанне выплаты доўгу ўжо на карысць Мінскай праваслаўнай духоўнай кансісторыі разглядалася адміністрацыяй наступнікаў Радзівілаў – Вітгенштэйнаў – у 1854 г. Таму асабліва важнай рабілася прамоцыя культу абраза Новасвержанскай Божай Маці, ахвяраванні на які сталі адной з асноўных крыніц прыбытку манастыра.

**Дзяніс ЛІСЕЙЧЫКАЎ**

*(Працяг будзе)*




*Абраз «Божая Маці Свержанская» (Новасвержанская). Гравюра з кнігі «Поўня прыгажэйшая за Месяц, якая служыць промнямі ласкі для свету». Нясвіж, 1754.*



*Абраз «Божая Маці Свержанская» (Новасвержанская). Палатно, алей. З могілкавай капліцы в. Самуйлавічы Мастоўскага раёна, XVIII ст.*

Важным элементам папулярызацыі царквы (а пазней і манастыра) у Новым Свержні была наяўнасць тут цудатворнага абраза Маці Божай. Легенда сведчыць аб тым, што яго знайшлі ў пушчы на дрэве каля 1500 г. і, відавочна, тады ж даставілі ў царкву. Гэтыя звесткі не маюць пад сабой грунту. У такім выпадку абраз мусіў быць перададзены ў царкву Старога Свержня і знаходзіцца там, бо новасвержанскай царквы і мястэчка тады яшчэ проста не існавала. Легенда ж сцвярджае, што абраз у 1500 г. быў знойдзены акурат на тым месцы, дзе пазней была пабудавана мураваная новасвержанская царква. Зрэшты, ускосна аб яго пазнейшым паходжанні гаворыць і асноўная крыніца па гісторыі абраза. У 1650 г. рымска-каталіцкім новасвержанскім святаром смаленскім канонікам Пятром Вагнерам Дунгоўскім была складзена рукапісная кніга цудаў абраза Новасвержанскай Божай Маці «*Поўня або Поўнасць дабрадзействаў Маці Божай Свержанскага абраза*». У ёй былі апісаны цуды, якія адбыліся ў прамежку ад 1636 да 1650 гг. Верагодней за ўсё, абраз быў змешчаны ў царкве не нашмат раней за час самага ранняга зафіксаванага цуду (г.зн. у першай чвэрці XVII ст.). Значнасць і атракцыйнасць яго была такой, што на думку некаторых даследчыкаў, імі тлумачыцца ўзвядзенне ў мястэчку мураванай царквы. Хоць гэтае сцвярджэнне не адпавядае рэальнасці, аднак, сапраўды, ужо ў сярэдзіне XVII ст. абраз Новасвержанскай Божай Маці прыцягваў шмат пілігрымаў. Масавыя паломніцтвы да яго пачаліся ў 1640-х гг. Аб гэтым гаворыць наступны факт. Калі ў 1645 г., на момант прызначэння на пасаду святара ў м. Новы Свержань Яна Далмацкага, побач з абразом знаходзіліся ўсяго 19 срэбраных ватыўных таблічак, то 27 ліпеня 1651 г. іх было ўжо 105. Візіта 19 лістапада 1680 г. фіксуе 113 срэбраных таблічак, а апрача іх яшчэ дзве срэбраныя кароны на цудатворным абразе і 67 іншых срэбраных ватыўных прадметаў. Пры апісанні «*пісанай па залатым фоне на драўлянай дошцы велічынёй у 1 аршын і 5 вяршкоў*» іконы ў 1879 г. на ёй згадваюцца ўжо паўнавартасныя срэбраныя шаты. Рукапіс быў дапоўнены апісаннямі цудаў ажно да пачатку 1750-х гг. і быў выдадзены ў Нясвіжы ў 1754 г. пад назвай «*Поўня прыгажэйшая за Месяц, якая служыць промнямі ласкі для свету*» дзякуючы намаганням рэктара семінарыі базыльяніна Інакенція Ясткевіча. Мэтай гэтага выдання было прыцягнуць цікавасць з боку пілігрымаў да абраза, што магло б істотна дапамагчы з ахвяраваннямі, якія былі так патрэбны новастворанай духоўнай семінарыі і манастыру.

# Базыльянскі манастыр і духоўная семінарыя ў Новым Свержні

*(Заканчэнне тэмы. Пачатак у № 38)*

Апісанне манастырскіх будынкаў ранняга перыяду выяўлена не было. Вядома толькі, што да пачатку 1770-х гг. яны прыйшлі ў заняпад: «*Манастыр гэты мае падраны дах, спарахнелыя сцены, усярэдзіне без печаў, вокнаў і падлогі*». Таму ў гэты час манастыр актыўна аднаўляў падсобныя гаспадарчыя памяшканні і ўзводзіў паркан. 19 чэрвеня 1778 г. рэктар Мялецій Луцкі прасіў радзівілаўскую адміністрацыю аб дазволе на атрыманне вялікай партыі дрэва. У 1811 г. базыльяне склалі спіс таго, што патрабавалася для паўнавартаснага функцыянавання манастыра. Па-першае, для забеспячэння адасобленага ладу жыцця манахаў неабходна было падалей аднесці прылеглыя мяшчанскія сядзібы і пабудаваць глухі паркан з варотамі. Па-другое, у царкве ўзводзілі вялікі алтар, для чаго закупілі *«240 камянёў мармуру»*, аднак усе муляры былі занятыя на радзівілаўскіх будоўлях. Па-трэцяе, побач з царквой планавалася выкапаць студню і ўзвесці гаспадарчыя пабудовы. Па-чацвёртае, манахі прасілі дазволу заняць адзін з пустуючых двароў за млынамі «*для адпачынку студэнтаў Вашай Княскай Міласці Дабрадзея і на ўсталяванне там гульні ў більярдныя шары*».

Сярод слуг-мужчын былі аканомы, парабкі, пастухі, фурманы, кухары. Іх колькасць вагалася ў залежнасці ад рэгулярнасці выплаты працэнтаў. Да 1820-х гг. слуг на кантракце ўжо не засталося, дапамагалі па гаспадарцы жабракі і дзеці беднай шляхты з навакольных засценкаў. Прадукты харчавання пастаўляліся з радзівілаўскіх маёнткаў. У квіце ад лютага 1744 г. новасвержанскія базыльяне адзначалі, што з маёнтка Пясочнае паступіла жытнёвае, пшанічнае і ячменнае збожжа, гарох, канаплянае семя, мак, ячневыя, аўсяныя, грэцкія і пшанічныя крупы, рэпа, морква, бацвінне, сечаная капуста, каровы, бараны, свінні, парасяты, гусі, качкі, куры, масла, алей, сыры, тлушч, соль, гарэлка, хмель. Асобныя прадукты пастаўляліся і з далёкіх маёнткаў. Так, у снежні 1747 г. для поснага стала манахаў і семінарыстаў купец з м. Лахва Навагрудскага павета Дарафей Самусевіч паставіў дзве бочкі рыбы. Закупкі рыбы былі важным элементам падрыхтоўкі да Вялікага посту. У 1810 г. з-за значнага падвышэння коштаў на прадукты і несвоечасовай выплаты працэнтаў новасвержанскія манахі не змаглі назапасіць дастатковай колькасці вэнджанай рыбы на Вялікі пост, і 11 лютага 1811 г. мусілі скласці аб гэтым адмысловы ліст да радзівілаўскай адміністрацыі.



*Царква Успення Багародзіцы ў м. Новы Свержань. Фота Вільгельма Дункерта. 1943 г.*

Ад пачатку семінарыя пазіцыянавалася менавіта як радзівілаўская навучальная ўстанова. Фундатар дазваляў набіраць дзяцей святароў з іншых парафій толькі ў тым выпадку, калі да неабходнай колькасці ў 12 семінарыстаў не хапала прэтэндэнтаў сярод дзяцей святароў з радзівілаўскіх маёнткаў. Аднак пасля таго, як семінарыя добра сябе зарэкамендавала, узніклі праблемы з празмерным наплывам прэтэндэнтаў. Ужо ў снежні 1747 г. у Новы Свержань прыбыў святар царквы з буйнога радзівілаўскага маёнтка Лахва Рыгор Ражановіч. Ён прасіў рэктара прыняць экзамен у сваіх сыноў і ўзяць іх у семінарыю, што і было зроблена, хоць яна ўжо была цалкам укамплектавана студэнтамі. Адмовіць святару з радзівілаўскага маёнтка рэктар не адважыўся і напісаў ліст М. К. Радзівілу з просьбай прыняць рашэнне. Радзівілы часта прасілі рэктараў падабраць прэтэндэнтаў на святарскія пасады пры асабліва важных для іх цэрквах. У 1755 г. той жа М. К. Радзівіл прасіў падабраць яму здольнага выпускніка на вакантную пасаду святара царквы ў м. Лахва.

Пры гэтым епархіяльная прыналежнасць царквы не мела значэння – галоўнае, каб храм знаходзіўся на радзівілаўскіх землях. Так, у жніўні 1758 г. рэктар Ю. Шаталовіч пісаў М. К. Радзівілу пра прэтэндэнта на святарскую пасаду ў м. Алыка на Валыні (на тэрыторыі Луцка-Астрожскай епархіі). У чэрвені 1782 г. ужо рэктар Ігнат Птак прасіў у К. С. Радзівіла «Пане Каханку» ўзяць пад сваю апеку выпускніка Яна Дылеўскага – прызначыць яго на вакантную пасаду святара пры якой-небудзь царкве на радзівілаўскіх землях.

Планавалася, што тэрмін навучання семінарыста будзе складаць 6 гадоў, аднак пры дастатковым узроўні падрыхтоўкі дапускалася прымаць выніковы экзамен і пасля двух гадоў навучання. Выпускнік семінарыі па яе заканчэнні мусіў мець дастатковы ўзрост для высвячэння ў сан. Паколькі гэта былі поўныя 24 гады, то меркавалася, што ў семінарыю не будуць прымацца прэтэндэнты, маладзейшыя за 18 гадоў. Аднак спіс студэнтаў за 25 жніўня 1795 г. сведчыць, што на той момант у семінарыі вучыліся 6 асоб узростам ад 16 да 20 гадоў. У 1817 г. – 6 асоб ад 12 да 31 года. Першы год усе семінарысты мусілі адбыць пробы, носячы цэлы год нешта накшталт манаскага адзення. Пасля іх заканчэння – падпісаць дакумент аб тым, што не ўступяць ні ў які ордэн, а будуць толькі парафіяльнымі святарамі. Семінарыя стала своеасаблівым сацыяльным ліфтам і дапамагала здольным дзецям святароў з адной часткі Кіеўскай мітраполіі знаходзіць месца службы ў іншай частцы, тым самым нярэдка скасоўваючы архаічную традыцыю, калі пры адной і той жа царкве стагоддзямі служылі прадстаўнікі аднаго роду.

З-за праблем з выплатай працэнтаў не заўсёды ўдавалася вытрымліваць устаноўленую колькасць семінарыстаў. У жніўні 1795 г. у семінарыі вучылася толькі палова ад належнай колькасці студэнтаў – 6. Манастыр пачаў браць на навучанне староннiх людзей, што не прадугледжвалася фундушом. Так, у тым жа жніўні 1795 г. у сценах семінарыі вучыўся выхадзец «з Польшчы» шляхціц лацінскага абраду Яўхім Рыгоравіч Дуніноўскі. Да 1811 г. удалося зноў набраць адпаведную колькасць алюмнаў (навучэнцаў). У канцы XVIII ст. пры манастыры апрача семінарыі дзейнічала і публічная трохкласная пачатковая школа. У 1797 г. у ёй было 25 вучняў. Але аб яе дзейнасці звестак практычна не захавалася.

На жаль, практычна няма звестак і аб арганізацыі навучальнага працэсу ў семінарыі ў другой палове XVIII ст. Лаканічна пра гэта згадваецца толькі ў дакументах 1810-х гг. Так, у 1817 г. тэалогія ў семінарыі выкладалася па кнізе Юзафа Нарольскага «*Маральная тэалогія, альбо Тое, што тычыцца паводзін*» і рукапісных працах прафесара тэалогіі Віленскага папскага алюмнату базыльяніна Амброзія Кірыята, катэхізіс – па кнігах Роберта Беларміна, арыфметыка – па падручніку «*Арыфметыка для народных школ*», выдадзеным Адукацыйнай камісіяй яшчэ ў 1780-я гг. Таксама ў семінарыі выкладаліся навукі «*спеваў, прынятых ва Усходняй Царкве*», практыкі ўдзялення Святых Сакрамантаў, адпраўлення літургіі і чытання малітваў. Атэстаты, якія выдаваліся выпускнікам ў 1820-х гг., сведчаць, што ім выстаўляліся адзнакі за чытанне і пісанне па-польску і па-царкоўнаславянску, хрысціянскую навуку, маральную тэалогію, рытуал, фарміраванне характару, паводзіны. Да канца 1810-х гг. атэстаты выдаваліся на лацінскай мове, а з 1819 г. пачалі выдавацца на польскай.

Манастырская бібліятэка ў 1821 г. налічвала 240 кніг пераважна на лацінскай мове, а таксама на польскай. Паводле тэматыкі яна складалася з «*гістарычных, рытарычных, філасофскіх, і пераважна багаслоўскіх кніг*». Быў і камплект літургічных кніг на царкоўнаславянскай мове.

Важным падаецца ўстанавіць, як здзяйсняўся трансфер ведаў у семінарыі. Інача́й кажучы, які быў узровень адукацыі саміх выкладчыкаў і дзе яны вучыліся? На жаль, удалося ўстанавіць месца і час навучання толькі ў іх часткі. 5 выкладчыкаў (Г. Гаеўскі, М. Гедройць, І. Манкевіч, У. Пулкатыцкі і Я. Ястрэмбскі) вучыліся ў Віленскім папскім алюмнаце, І. Манкевіч і М. Мазаноўскі скончылі Папскі ўрбаніянскі калегіум прапаганды веры ў Рыме, М. Гедройць і І. Верашчака – Папскі грэцкі калегіум Св. Афанасія ў Рыме, І. Шымкевіч – езуіцкі калегіум у прускім Браўнсбергу (т.зв. Collegium Hosianum). Бадай, самым адукаваным сярод усёй новасвержанскай прафесуры быў рэктар Цімафей Шчуроўскі. Ён меў шляхецкае паходжанне, нарадзіўся ў 1740 г. у маёнтку Лішня Валынскага ваяводства ў сям'і уладзімірскага суддзі. З 1764 г. вывучаў тэалогію ў школе пры Полацкім манастыры Св. Сафіі, з 1765 г. – у Віленскім манастыры Св. Тройцы, у 1776-м у Рыме атрымаў ступені доктара кананічнага права і тэалогіі.



*Адбіткі пячаткі рэктара Новасвержанскай духоўнай семінарыі: 1 – Сажавая. Матрыца выкарыстоўвалася ў 1743 – 1818 гг.; 2 – Сургучная. Матрыца выкарыстоўвалася ў 1743 – 1818 гг.; 3 – На кустодзеі. Матрыца выкарыстоўвалася ў 1743 – 1818 гг.; 4 – Сажавая. Матрыца выкарыстоўвалася ў 1819 – 1833 гг.*

Першы вядомы адбітак пячаткі рэктара семінарыі датуецца сярэдзінай 1740-х гг. На пячатцы авальнай формы выяўлены відазменены герб Радзівілаў – чорны арол з княскай каронай, на грудзях якога тарча з грэцкай абрэвіятурай «IXΣ» замест звычайных радзівілаўскіх «Трубаў». Як і на традыцыйным радзівілаўскім гербе, арол змешчаны пад княскай мантыяй і княскай каронай. Па коле пячаткі маецца лацінамоўная легенда: «SIGIL(LUM) RECTOR(IS) COL(LEGII) SVERSAN(ENSIS) RADIVILIAN(ORUM) DUC(UM) O(RDINI) S(ANCTI) BASIL(II) MAGNI» («Пячатка рэктара Сверажанскага калегіума князёў Радзівілаў ордэна Святога Васіля Вялікага»). Самы позні адбітак гэтай пячаткі быў выяўлены на дакуменце ад 3 снежня 1818 г. На дакуменце, які выйшаў са сцен семінарыі 23 чэрвеня 1819 г., змешчаны адбітак ужо новай пячаткі. На пячатцы авальнай формы выяўлены герб Расійскай імперыі – двухгаловы арол, на грудзях якога змешчана выява Св. Георгія. Па коле пячаткі маецца рускамоўная легенда: «ПЕЧАТЪ НАСТОЯТЕЛЯ МОНАСТИРА СВЕРЖЕН(С)КОГО».

Перад прыездам у Новы Свержань выкладаў у базыльянскай семінарыі ва Уладзіміры. Рэктарам ці, дакладней, часовым адміністратарам Новасвержанскага манастыра і семінарыі ён пабыў нядоўга ўлетку 1784 г. Да гэтага часу манастыр больш за 10 гадоў ужо не атрымліваў працэнты, і надзвычай адукаваны і здольны Ц. Шчуроўскі быў прызначаны К. С. Радзівілам настаяцелем манастыра ў Радзівілаўскай Белай-Падляшскай. Менавіта там ён падрыхтаваў і ў 1792 г. выдаў знакаміты падручнік «*Кананічнае права аб усяляких сінадальных статутах і дэкрэтах, ва ўсіх сферах і выпадках*», які стаў на дзесяцігоддзі настольнай кнігай кожнага адукаванага базыльяніна і прадстаўніка белага духавенства.

З канца XVIII ст. канкурэнцыю Новасвержанскай семінарыі пачала складаць новая семінарыя пры манастыры ў в. Лаўрышава Навагрудскага павета (створаная паводле пастановы базыльянскай кангрэгацыі ў Навагрудку 20 мая 1799 г.). Яна мела значна больш маёмасці ўключна з уласным фальваркам Новы Двор. У першае дзесяцігоддзе яе існавання тут вучыліся 20 семінарыстаў. Аднак у 1828 г. абедзве семінарыі былі закрыты ў выніку адміністрацыйных рэформ Уніяцкай Царквы ў Расійскай імперыі. З 1828 г. замест Брэсцкай, Літоўска-Віленскай, Луцкай і Полацкай уніяцкіх епархій утвараліся дзве вялікія, выцягнутыя з поўначы на поўдзень, – Літоўская і Беларуская. Епархіяльнымі семінарыямі сталі Жыровіцкая і Полацкая, дзейнасць усіх астатніх прыпынялася, а іх фундушы і нерухомая маёмасць перадавалася ў Жыровічы альбо Полацк.

Манастыр у Новым Свержні быў закрыты паводле ўказа грэка-ўніяцкай духоўнай калегіі ад 14 чэрвеня 1833 г. Меркавалася часова пакінуць пры ім настаяцеля і парафіяльнага святара да прызначэння настаяцеля з ліку белага духавенства. 1 студзеня 1836 г. пры новасвержанскай парафіяльнай царкве ў якасці настаяцеля адзначаны прадстаўнік белага духавенства Ян Манькоўскі. У 1854 – 1855 гг. былая манастырская бібліятэка, дзе з 240 кніг засталося 117, была перададзена ў Мінскую праваслаўную духоўную семінарыю. У пачатку 1864 г. царква не менш за 10 разоў падпальваў па невядомых прычынах мясцовы селянін Мікалай Тумікоўскі. Паколькі будынак быў мураваны, то падпалы наносілі шкоду ў асноўным гаспадарчым пабудовам і паркану. Аднак 5 мая 1864 г. падпальшчыку ўдалося ўчыніць вялікі пажар, у ходзе якога была пашкоджаная і левая частка царквы разам з унутраным убранствам і тынкоўкай. У выніку пажару ў канцы 1860-х гг. адзін са званоў, які размяшчаўся на царкоўнай званіцы над прытворам, абарваўся. Гэта стала прычынай таго, што ўсе званы з мураванай царкоўнай вежы-званіцы былі зняты і размешчаны ў адмыслова пабудаванай званічцы ў варотах, якая захаваўся і да нашага часу. У канцы 1890-х гг. царква была капітальна адрамантавана пасля наступстваў пажару.

*Дзяніс ЛІСЕЙЧЫКАЎ*

# Зямны акіян Эдзі Агняцвет

**(*Заканчэнне. Пачатак на стар. 1*)**

## Лісты Эдзі Агняцвет

6 жніўня 1988 года, Мінск

Добры дзень, Сяргей!

Прашу прабачэння за тое, што адказваю з некаторым спазненнем. Учора прыехала дадому, з прыемнасцю прачытала Ваш ліст. Вельмі добрая ў Вас задума – сабраць поўныя звесткі і напісаць кнігу (а, можа, і не адну!) пра выдатных людзей, чый лёс быў звязаны з дзівосным кутком Беларусі – Слонімшчынай. А стварыць літаратурна-гістарычны музей – гэта трэба відаць ад сэрца.

Перакладаючы Апалінэра, я многае прачытала пра яго на французскай і рускай мовах. Яго кнігі ў арыгінале брала з Дзяржаўнай бібліятэкі. Выданне ўнікальнае! Доўга трымала кнігі ў сябе, але ж бібліятэку нельга падводзіць. І яны зноў у запасніках аддзела зарубежнай літаратуры. Дарэчы, кнігі былі неразрэзаныя, да мяне ніхто імі, на жаль, не карыстаўся.

Ёсць у мяне аповесць Юліі Хартвіг [Юлія Хартвіг (1921 – 2017) – польская пісьменніца. – **С. Ч.**] «Аполлинер». Шчыра кажучы, шкада з ёю развітвацца... І ўсё ж, думаю падараваць Вам яе. Калі Вы будзеце ў Мінску – патэлефануйце мне, калі ласка, па тэл. 33-44-58. Падпішу Вам і свайго Апалінэра.

Ці вядома Вам імя Яўгена Варфаламеевіча Леашэні [Яўген Леашэня (1900 –1981) – генерал-лейтэнант інжынерных войск, краязнавец. – **С. Ч.**] – генерала-лейтэнанта артылерыі – выдатнага чалавека, які родам быў са Слонімшчыны? Ён добра ведаў Якуба Коласа, напісаў гісторыю свайго краю. Праўда, ніхто гэтага не друкаваў.



*Эдзі Агняцвет*

Удзячна Вам за добрае, шчырае слова пра маю работу! А Ваша імя сустракаю ў друку, чытаю і жадаю найлепшых поспехаў!

Эдзі Агняцвет.

15 жніўня 1988 года, Мінск

Дзень добры, Сяргей!

Ваша зацікаўленасць сувязямі слаўнага земляка Я. В. Леашэні мне зразумела. Яўген Варфаламеевіч напісаў успаміны пра Якуба Коласа, якія змешчаны ў кнізе «У сэрцы народным» (Мн., 1967, с. 206 – 212). Назва артыкула «З незабыўнага».

Асабіста я пазнаёмілася з Яўгенам Варфаламеевічам у сваім юнацтве-маладосці на свяtкаванні 60-годдзя Якуба Коласа ў Ташкенце. У той час ён, здаецца, некалькі месяцаў знаходзіўся з ваеннай акадэміяй у Сярэдняй Азіі. Пасля, значна пазней, перапісвалася з ім, сустракалася ў Маскве. Ён прысылаў мне не толькі лісты, а і кнігі. Чалавек незвычайнай дабрыні, розуму, эрудыцыі. Пра яго – мой верш «Лісты генерала Леашэні» са зборніка «Заказаным» (Мн., 1986):

*Не зрабілі Вас саноўным*
*Ні пасады, ні чыны.*
*Бераг помнілі галоўны –*
*Рэчку Ісу і чаўны.*
*Там дзяцінства,*
*там краіна*
*Самых светлых, мілых год.*
*Там сцяжынкі*
*Альбярціна,*
*Дзе бярэ пачатак род.*
*Бачылі Вы прад сабою*
*Медуніцы ў бляску рос.*
*Хоць было не да спакою:*
*На вайне – ваенны лёс.*
*Хіба ведаюць біклажкі,*
*Дзе салдат, дзе генерал?*
*Сорак першы, самы цяжкі,*
*Ваша сэрца вывяраў.*
*На дарогах да Берліна –*
*Вашы смелыя масты...*
*Свецяць лісцем*
*Альбярціна*
*Вашы ціхія лісты.*
*Голас вернага служэння*
*З даваенных клікаў дзён,*
*Голас Карбышава: Жэня! –*
*Быў, як ласка і закон.*
*З-пад яго крыла Вы ўсталі*
*Нездарожаны, жывы.*
*...Хай бы вечна прыляталі*
*Вашы ластаўкі*
*з Масквы!*
*Быў апошні ліст*
*нязвычны*
*У прадчуванні небяспек.*
*Быў зварот,*
*як боль крынічны:*
*– Дарагі мой чалавек! –*
*Не мяне, а ўсіх дазвання*
*Вам хацелася сагрэць*
*На парозе развітання...*
*Я ж не веру ў Вашу смерць.*





У Маскве жыве яго ўдава Антаніна Іванаўна.

Успамінаю, як ён любіў беларускія народныя прыказкі. А першы раздзел з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» чытаў на памяць.

А пакуль да сустрэчы! З прывітаннем Эдзі Агняцвет.

3 кастрычніка 1992 года, Мінск

Паважаны Сяргей!

Выбачайце за трошкі запознены адказ на Ваш ліст, днямі вярнулася з Ісլачы.

Вельмі хацелася б дапамагчы Вам у пошуках Тодара Лебяды [Тодар Лебяда (Пятро Шырокаў; 1914 – 1970) – беларускі пісьменнік, двойчы быў рэпрэсаваны. – **С. Ч.**]. Бо трэба, каб кожнае таленавітае імя засталося ў памяці людской. На жаль, я не ведала ні яго, ні яго жонкі Басі Цыпінай і яе сваякоў. Пэўна, і ён родам са Слонімшчыны? Думаю так таму, што Вы занятыя пачэснай працай – шукаеце сляды сваіх землякоў, пішаце пра іх. Магу толькі пажадаць Вам удалых пошукаў і поспехаў!

І ў мяне да Вас ёсць просьба. Неяк у жніўні месяцы г.г. я паслала сваю новую кніжку «Рэчка, рэчанька мая» (для дзяцей) добрай паэтцы і настаўніцы Алене Руцкай [Алена Руцкая (1950) – беларуская пісьменніца і педагог. – **С. Ч.**]. Хацела зрабіць невялічкі падарунак ёй і вучням. Чамусьці яна маўчыць. Ці здаровая? Калі Вам няцяжка – знайдзіце, калі ласка, Алену Вітальеўну і запытайце аб маім пасланні. Жыве яна таксама на вул. Брэсцкай, 97, кв. 6. Буду ўдзячна. А пакуль усяго Вам найлепшага! Эдзі Агняцвет.

3 сакавіка 1997 года, Мінск

Добры дзень, Сяргей!

У першы дзень вясны мяне ўзрадавалі Вашы пранікнёныя радкі ў «Народнай газеце». Віншую, жадаю новых удач!

Як вам працуецца? Ці збіраеце звесткі пра сваіх добрых слонімскіх землякоў? Хацела паслаць, альбо пераслаць Вам некаторыя



*Яўген Леашэня*

лісты генерала Леашэні і адну кнігу перакладаў Жукоўскага, з якою мне шкада развітацца (падарунак Яўгена Варфаламеевіча). Калі будзеце ў Мінску – тэлефануйце мне па тэл. 2-33-44-58. А пакуль усяго найлепшага! Эдзі Агняцвет.

18 верасня 1997 года

Вітаю Вас, Сяргей!

Думала, што за лета Вы знойдзеце магчымасць пад'ехаць у Мінск і забраць у мяне лісты Вашага слаўнага земляка генерала Леашэні (для Слонімскага музея). Хацела падараваць і кнігу з яго хатняй бібліятэкі, але яна тоўстая – Гамер «Адысея». Для пасылкі не падыходзіць.

Як зрабіць? Можа, пакуль пашлю Вам лісты і адну слонімскую газету? Ці ёсць у Вас здымак Яўгена Леашэні ў генеральскім адзенні?

Пішу па Вашаму хатняму адрасу, але, пэўна, ёсць і адрас музея. А кніжкі вашай у мяне няма.

Чакаю адказу. З пашанай Эдзі Агняцвет.

7 кастрычніка 1997 года, Мінск

Дарагі Сяргей Мікалаевіч!

Дзякуй Вам за светлыя радкі, узгаданыя на берагах Шчары! Жадаю новых удач, творчага шчасця! Мяне радуе тое, што Вы задумалі напісаць кнігу пра свайго слаўнага земляка генерала Леашэню. Неяк была я ў Маскве, бачыла яго і жонку ў хатніх умовах. Які сціплы чалавек! Гэта не сучасныя паны з іхнімі катэджамі. Прыязджайце нарэшце ў Мінск. Чым магу – дапамагу. Навошта ляжаць яго лістам і маім успамінам на архіўных паліцах? Здаецца, я давала Вам свой хатні тэлефон? З найлепшымі пажаданнямі Эдзі Агняцвет.

P. S. Пра вашу кніжку больш падрабязна пагутарым пры сустрэчы.